УКД 340.153

***Алена Валер'еўна Кожар***
*ст. выкладчык каф. «Эканоміка і права» Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, аспірант 2-га года навучання каф. тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
***Alena Kozhar***
*Senior Lecturer of the Department of «Economics and Law» of Belarusian National Technical University, Post-Graduate Student of 2 Years of Study at the Department Theory and History of State and Law of the Belarusian State University*
e-mail: lobuzova@mail.ru

# ЗМЕНЫ Ў СТАТУСЕ СЯЛЯНСКІХ ЗЕМЛЕЎЛАДАННЯЎ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

*Разглядаецца аб'ём паўнамоцтваў сялян у адносінах да зямельных надзелаў у першай палове XVI ст. Даследуюцца пытанні наяўнасці права ўласнасці сялян на зямлю ў гэты перыяд. Даецца аналіз крыніц права, якія замацоўвалі правы сялян на зямлю. Праводзіцца аналіз дагавораў па распараджэнні зямлёй (куплі-продажу, заставы), якія сяляне заключалі як паміж сабой, так і з прадстаўнікамі іншых саслоўяў. На падставе аналізу актавых матэрыялаў і прававых крыніц зроблена выснова аб абмежаванні правоў сялян феадаламі і замацаванні гэтых абмежаванняў у прававых актах. Таксама сцвярджаецца, што пераважная большасць сялян Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове XVI ст. ужо не з'яўлялася ўласнікам зямлі, а валодала толькі правам пажыццёвага спадчыннага землекарыстання.*

***Ключавыя словы:*** *сяляне, землеўладанне, землекарыстанне, дагавор заставы, дагавор куплі-продажу, старына.*

## *Changes in the Status of Peasant Landholdings in the Grand Duchy of Lithuania in the First Half of the XVI Century*

*The article deals with the issues of the limit of the peasants' powers in relation to land in the first half of the XVI century. The questions of the existence of the peasants' ownership of land in this period are investigated. The analysis of the sources of law that secured the rights of peasants to land is given. The analysis of contracts for the disposal of land (purchase-sale, pledge), which the peasants concluded, both among themselves and with representatives of other estates, is carried out.Based on the analysis of the act materials and legal sources, the author draws conclusions about the restriction of the rights of peasants by feudal and the consolidation of these restrictions in legal acts. And also the conclusion that the vast majority of peasants of the Grand Duchy of Lithuania in the first half of the XVI century, They was no longer the owners of the land, but had only the right of lifelong inherited land use.*

***Key words:*** *peasants, land owenership, land use, outpost agreement, sales contract, antiquity.*

## Уводзіны

Пытанні аб гісторыі паўнамоцтваў і абавязкаў сялян у дачыненні да зямлі заўсёды цікавілі навукоўцаў. Асабліва з пачатку XX ст. расійскія і айчынныя навукоўцы пачалі больш актыўна займацца даследаваннем развіцця сельскай гаспадаркі і становішча сялян Вялікага Княства Літоўскага – дзяржавы, палітыка-эканамічным цэнтрам якой былі беларускія землі. Цікавасць да гэтых пытанняў у першую чаргу была абумоўлена тым, што сяляне на працягу стагоддзяў з'яўляліся асноўным вытворчым класам, і адносіны іх да зямлі як асноўнага сродку вытворчасці мелі важнае значэнне ў дзяржаўна-прававым развіцці.

На сучасным этапе развіцця дзяржавы пытанні землекарыстання і землеўладання не страцілі сваёй актуальнасці. Імклівае развіццё зямельнага заканадаўства і зараз патрабуе ад даследчыкаў не толькі вырашэння сучасных праблемных пытанняў у дадзенай сферы, але і вывучэння гістарычнага вопыту рэгулявання зямельных адносін з мэтай найбольш эфектыўнага выкарыстання зямельных рэсурсаў і вызначэння больш дасканалых формаў і метадаў землекарыстання.

*Навуковы кіраўнік – Таісія Іванаўна Доўнар, доктар юрыдычных навук, прафесар, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

Нягледзячы на тое, што асобныя аспекты праблемы сялянскага землекарыстання і землеўладання ў Вялікім Княстве Літоўскім закраналіся вучонымі (у асноўным гісторыкамі), аднак яны больш звярталі ўвагу на практыку сялянскага землекарыстання і не рабілі абагуленага аналізу яго нарматыўнай рэгламентацыі. Менавіта таму гэтая праблема патрабуе навуковага разгляду.

Мэтай дадзенага даследвання з'яўляецца тэарэтыка-прававы аналіз пытанняў сялянскага землеўладання ў Вялікім Княстве Літоўскім у XV – першай палове XVI ст.

**Асноўная частка**

У вызначаны перыяд у Вялікім Княстве Літоўскім адбываўся працэс актыўнага развіцця розных формаў землеўладання і землекарыстання. З актывізацыяй грамадскіх адносін прававыя акты хутка змяняліся, уступаючы ў супярэчнасць са звычаем, што выклікала шматлікія калізіі і незадаволенасць насельніцтва. У сувязі з гэтым нормы звычаёвага права пачалі актыўна замацоўвацца ў нарматыўных актах дзяржавы. Складанасць сялянскага землекарыстання ў гэты час была абумоўлена і тым, што ў пачатку XVI ст. пачаўся працэс замацавання права феадальнай уласнасці на зямлю, што пацягнула за сабой абмежаванне па саслоўным прынцыпе аб'ёму паўнамоцтваў сялян як суб'ектаў зямельных зносін.

Пытанню паўнамоцтваў сялян у дачыненні да зямлі шмат увагі надавалі дарэвалюцыйныя вучоныя (М. Ф. Уладзімірскі-Буданаў, І. П. Навіцкі, М. К. Любаўскі і інш.), прычым яны выказвалі розныя погляды на яго. Так, напрыклад, М. Ф. Уладзімірскі-Буданаў, спасылаючыся на тое, што ў дакументальна-прававым матэрыяле захаваліся факты здзяйснення здзелак па продажу або закладу зямлі, рабіў выснову, што сяляне ўвогуле маглі адчужаць зямлю, з чаго вынікала, што яны распараджаліся ёю як уласнікі [1, с. 20; 24].

Таксама меркаванне аб тым, што сяляне мелі права ўласнасці на зямлю, падтрымліваў І. П. Навіцкі. Вучоны зрабіў выснову, што ў XV–XVI стст. сяляне не былі абмежаваны ў распараджэнні сваёй зямлёй і валодалі такімі самымі правамі на зямлю, як і вышэйшае саслоўе [2, с. 12]. Аўтар падкрэслівае, што нават пасля прыняцця Статута Вялікага Княства Літоўскага (1529 г.) сяляне працягвалі распараджацца сваёй зямлёй, аб чым сведчаць дагаворы залогу зямлі (т. зв. заставы) [2, с. 54].

М. К. Любаўскі, наадварот, адмаўляў права ўласнасці сялян на зямлю і магчымасць распараджэння ёй, абгрунтоўваючы гэта тым, што вучоныя, якія лічылі, што такое права ў сялян было, «не умели выделить юридическаго элемента и принимали за нормы права казусы и факты» [3, с. 373].

Гісторыкі савецкага перыяду, разглядаючы пытанне сялянскага землекарыстання і землеўладання, таксама не прыйшлі да адзінай высновы. Напрыклад, В. Ф. Голубеў сцвярджаў, што да канчатковага запрыгоньвання сялян, якое адбылося, як ён лічыў, ужо ў сярэдзіне XVI ст., сяляне валодалі правам уласнасці на зямлю. Паралельна з працэсам запрыгоньвання сялян ішло пазбаўленне сялян права распараджэння зямлёй. Ужо ў пачатку другой паловы XVI ст., асабліва пасля прыняцця Уставы на валокі (1557 г.), большасць сялян не мела ў адносінах да зямлі правамоцтваў уласніка. За імі замацоўвалася толькі права карыстання і валодання зямлёй [4, с. 22, 24].

П. Г. Казлоўскі ўвогуле адмаўляў права ўласнасці сялян на зямлю, адзначаючы, што па Статутах Вялікага Княства Літоўскага замацавалася права ўласнасці на зямлю за класам феадалаў [5, с. 146–147]. Такога ж пункту гледжання прытрымліваўся М. Ф. Спірыдонаў, які пісаў, што права распараджэння зямлёй заўсёды было толькі ў феадалаў [6, с. 60]. Ён заўважаў, што адсутнасць права сялян распараджацца зямлёй было юрыдычна замацавана яшчэ прывілеем вялікага князя Ягайлы (1387 г.). Пры гэтым навуковец не адмаўляе фактаў ажыццяўлення сялянамі куплі-продажу і заставы зямлі. Ён зрабіў выснову, што дзяржава дазваляла праводзіць такія здзелкі толькі з дазволу ўласніка зямлі. Пры гэтым такія асобныя здзелкі не могуць служыць доказам права ўласнасці сялян на зямлю, якой яны карысталіся толькі пры ўмове выканання павіннасцей [6, с. 61; 64].

Закранаюць гэтую складаную праблему права аб праве ўласнасці сялян на зямлю і сучасныя даследчыкі. Так, І. Г. Яцкевіч, абвяргаючы высновы папярэдніх вучоных, адзначае, што феадальнае права не пазбаўляла сялян права ўласнасці на зямлю, а толькі замацоўвала падначалены характар права

уласнасці селяніна ў адносінах да права ўласнасці вялікага князя і феадалаў [7, с. 9].

Пры аналізе гэтага праблемнага пытання звернем увагу, што першапачаткова ў Вялікім Княстве Літоўскім, як і ў старажытных княствах, сяляне свабодна, як указваюць вучоныя [3, с. 102], займалі ўчасткі зямлі і распрацоўвалі іх пад ворыва. Дзяржаўная ўлада на той час яшчэ не ў сілах была цэнтралізавана займацца ўладкаваннем сялян на зямлі, тым больш юрыдычна замацоўваць правы сялян на зямлю. Яна больш клапацілася аб абкладанні сялян павіннасцямі і подацямі на карысць дзяржавы. Тым больш, што ў той час вялікакняжацкі прыбытак з'яўляўся адначасова і дзяржаўным прыбыткам.

Увогуле селянін самастойна займаў пэўны надзел зямлі, і, калі яго не хапала, ён распрацоўваў новы. На той час селянін лічыўся ўласнікам зямлі і мог вольна распараджацца ёй, што і замацоўваў звычай. Як правіла, згодна звычаёваму праву сяляне станавіліся ўласнікамі зямлі па даўнасці яе ўжывання ці атрымаўшы яе ў спадчыну.

Паступова ў кантэксце развіцця феадалізму пашыралася вотчыннае землекарыстанне, у асноўным шляхам замацавання так званых зямельных «пажалаванняў». Пры гэтым вялікі князь і мясцовыя князі заўсёды мелі поўнае права ўласнасці на зямлю з правам яе адчужэння. Аднак паступова гэтае права адносна ўсёй зямлі стала належыць толькі вялікаму князю. Як указвае І. Г. Яцкевіч, прэзумпцыя таго, што вялікі князь (уладар дзяржавы) мае права ўласнасці на зямлю ўсёй дзяржавы, дазваляла яму з уласных фінансавых і гаспадарчых інтарэсаў адымаць любыя землі, як дараваныя, так і набытыя на падставе даўнасці валодання або атрымання ў спадчыну, і перадаваць іх новым трымальнікам, аддаючы часам ранейшым уладальнікам якія-небудзь іншыя землі [8].

У канцы XV – пачатку XVI ст. у кантэксце працэса афармлення шляхты як саслоўя вельмі распаўсюджаным стала падараванне вялікім князем зямель з сялянамі феадалам за вайсковую ці іншую службу, а таксама падараванне зямель царкве. Вольныя сяляне ў гэты час выплочвалі падаткі на карысць дзяржавы, а калі не мелі магчымасці іх выплаціць, то адпрацоўвалі даўгі і тым самым траплялі ў эканамічную залежнасць ад феадала. Усё гэта выклікала хуткі працэс запрыгоньвання сялян, які юрыдычна быў распачаты прыняццем Прывілея Казіміра (1447 г.). Як адзначаў М. Ф. Спірыдонаў, да сярэдзіны XVI ст. большая частка сялян ужо была запрыгонена [9, с. 21]. Менавіта паралельна з працэссам запрыгоньвання сялян ішоў працэсс іх пазбаўлення правоў, у тым ліку на зямлю. Улічваючы, што стагоддзямі сяляне лічылі зямлю сваёй уласнасцю, працэс абмежавання іх правоў працягваўся вельмі доўга і выклікаў пастаянную незадаволенасць сялян.

Пра тое, што сяляне доўгі час ставіліся да зямлі як да сваёй маёмасці, сведчаць гістарычныя факты, у тым ліку тое, што зямлю яны атрымлівалі ў спадчыну як «дедичную» і «отчизную». І нават калі селянін пакідаў свой надзел, іншыя сяляне не займалі яго і фактычна надзел захоўваўся за былым уладальнікам [10, с. 7].

Складанасць пытання адносна аб'ёму паўнамоцтваў, якімі валодалі сяляне ў дачыненні да зямлі, абумоўлена і тым, што правы сялян на зямлю нават на пачатку XVI ст. не былі дакладна вызначаны ў прававых актах Вялікага Княства Літоўскага і рэгуляваліся ў асноўным звычаёвым правам, галоўным прынцыпам якога было непарушэнне «старыны». Увогуле сялянамі «старына» атаясамлівалася са звычаем ці традыцыяй. Насельніцтва адносілася да «старыны» як да непарушнага права, таму пры спробах феадалаў і прадстаўнікоў княжацкай адміністрацыі ўвесці нейкую «навіну» сяляне ў розных формах выказвалі пратэст. Сярод прававых спосабаў такога пратэсту з'яўлялася права падачы скаргі вялікаму князю на парушэнне «старыны», што нават было адлюстравана ў заканадаўстве. Акрамя таго, характэрнымі былі неправавыя спосабы пратэсту, у тым ліку ўцёкі ад свайго феадала, адказ ад выканання павіннасцей і інш.

Патрэбна адзначыць, што на той час звычаёвае права характарызывалася не толькі кансерватызмам, але і партыкулярызмам, які праяўляўся ў тым, што ў кожнай мясцовасці дзейнічала сваё звычаёвае права, якое магло адрозніватца ад норм, што дзейнічалі ў суседняй воласці. Таму і пытанні сялянскага землекарыстання і землеўладання вырашаліся «старыной» у кожнай мясцовасці па-рознаму. Такая ж разнастайнасць была і ў пытаннях абкладання сялянскіх надзелаў

павіннасцямі. Партыкулярызм звычаёвага права ствараў шматлікія варыянты павіннасных адносін сялян у розных рэгіёнах Вялікага Княства Літоўскага.

Кансерватызм звычаёвага права праяўляўся ў тым, што нормы «старыны» насельніцтва ўспрымала як непарушныя і ўстойлівыя, таму яны цяжка змяняліся. «Старына» замацоўвала парадак, які ўсталяваўся яшчэ пры дзядах і бацьках. Як указвае А. Груша, «існуючы парадак быў правераны мінулымі пакаленнямі, значыць, ён з'яўляўся прымальным для сучаснікаў» [11, с. 219]. Таму гэты парадак лічыўся рацыянальным.

Пры гэтым «старына» не магла не падвергнуцца зменам, хоць гэта адбывалася і не часта. Пэўныя новыя нормы, звязаныя, як правіла, з сацыяльна-эканамічным развіццём дзяржавы, калі не выклікалі супраціву мясцовага насельніцтва, пачыналі ўжывавацца і праз пэўны час ужо лічыліся «старыной». Таму атрымлівалася, што нормы «старыны» не спынялі грамадскае жыццё, а са згоды самога грамадства падвяргалі гэтае жыццё зменам.

Зразумела, што «старына» як прынцып звычаёвага права, які быў непарушным і абавязковым для выканання, падтрымліваўся толькі пры санкцыі дзяржавы. Напрыклад, калі вялікаму князю неабходна было ўвесці новы падатак, то, нягледзячы на парушэнне ім «старыны», ён выдаваў такі закон («ліст», грамату і інш.), бо інтарэсы дзяржавы і павелічэнне дзяржаўных даходаў былі для яго на першым месцы.

Даволі доўгі час «старына» выкарыстоўвалася пры вырашэнні зямельных спрэчак як паміж сялянамі, так і паміж землеўладальнікамі. Адпаведна звычаям для «старыны» не патрабавалася пісьмовае замацаванне. Напрыклад, пры разглядзе судовай зямельнай справы выклікаліся сведкі, якія бачылі тое, пра што сведчылі ці чулі ад кагосьці. Даўнасць, на якую спасылаліся сведкі, вымяралася не гадамі, а пакаленнямі і звычайна закранала два папярэднія пакаленні – бацькоў і дзядоў. Пры гэтым, як сведчаць крыніцы, калі бакі ў судовай справе спасылаліся на пісьмовыя дакументы і на «старыну», менавіта нормы «старыны» лічыліся больш значнымі і рашэнне выносілася адпаведна прынцыпа: «старыны не рушыць і навіны не ўводзіць» [12, № 109].

Нават самі юрыдычныя дакументы часта знаходзілі сваю апору ў такім інстытуце як «старына». Так, дакумент меў вагу, калі яго сапраўднасць можна было пацвердзіць паказаннямі сведкаў, якія абапіраліся на «старыну». Для суда нават было дастатковым, каб справа была даказана не дакументамі, а проста «достаточнымъ а слушнымъ сведецствомъ» [9, с. 390].

Адносна права ўласнасці на зямлю у той час ужо было добра вядома, што ўласнік рэчы валодае правамоцтвамі карыстання, уладання і распараджэння. Бясспрэчна, што сяляне карысталіся і валодалі зямлёй. Аднак для раскрыцця пытання аб існаванні права ўласнасці на зямлю ў сялян перш за ўсё трэба прааналізаваць крыніцы, якія змяшчаюць звесткі менавіта пра распараджэнне сялянамі сваімі зямельнымі надзеламі.

Найбольш цікавымі для вызначэння правоў сялян на зямлю з'яўляюцца крыніцы, якія змяшчаюць разгляд адміністрацыйных і судовых спраў у дачыненні здзелак сялян па распараджэнню зямлёй. Аналіз гэтых спраў найбольш дакладна адлюстроўвае тыя грамадскія адносіны, якія склаліся ў дзяржаве, а таксама дазваляе даведацца пра прававыя звычаі, на якія спасылаюцца сяляне пры вырашэнні спраў. Улічваючы, што звычаі насілі вусны характар і не былі пісьмова замацаваны, судовая практыка (запісы разгляду судовых спраў, якія дайшлі да нашага часу) дазваляе больш поўна ўсвядоміць гэтае пытанне.

Так, у першай палове XVI ст. сяляне ажыццяўлялі шматлікія здзелкі ў дачыненні да зямлі. У тым ліку імі заключаліся даволі шматлікія дагаворы куплі-продажу зямлі, заставы, мены, дарэння і інш. Таксама зямля часта перадавалася ў спадчыну па завяшчальных запісах (тэстаментах). Асноўнымі відамі здзелак заставаліся купля-продаж і застава-закуп зямлі. Як сведчаць дакументы, здзелкі па куплі-продажу і па заставе-закупе зямель сярод сялян былі дастаткова распаўсюджанымі да прыняцця Устава на валокі (1557 г.), які забараніў сялянам здзяйсняць здзелкі па распараджэнні зямлёй. Пры гэтым дагаворы куплі-продажу зямлі дзяржаўныя сяляне заключалі як з іншымі сялянамі, так і з прадстаўнікамі іншых саслоўяў (шляхтай, мяшчанамі). Згодна са здзелкай прадавец перадаваў зямлю іншай асобе пажыццёва за пэўную суму

грошай. Пакупнік зямлі мог цалкам ёй распараджацца: карыстацца, валодаць, перадаваць у спадчыну, застаўляць ці аддаваць трэцім асобам [13, с. 94]. Дагавор заключаўся ў пісьмовай форме ў выглядзе купчага ліста, замацоўваўся пячаткамі сведак і перадаваўся пакупніку. У XVI ст. такія дагаворы, як правіла, павінны былі рэгістравацца ў судовых кнігах.

Таксама ў пачатку XVI ст. быў распаўсюджаны дагавор заставы зямлі, па якому селянін часова перадаваў крэдытору права карыстання і валодання зямлёй, а крэдытор даваў у доўг пэўную суму грошай. Да пагашэння доўгу крэдытор карыстаўся і валодаў зямлёй, а ў выпадку, калі даўжнік не мог вярнуць грошы, зямля заставалася крэдытору.

З прыняццем Статута Вялікага Княства Літоўскага (1529 г.) дзейнасць сялян па распараджэнні зямлёй абмяжоўвалася. Арт. 21 раздзелу 8 Статута замацоўваў, што нельга «закупати» землі ў сялян без дазволу яго пана [14, с. 101]. Дзяржаўныя сяляне павінны былі атрымаць дазвол на здзелку па распараджэнні зямлёй ад прадстаўнікоў органаў мясцовага кіравання. Пры вырашэнні пытання аб дазволе такой здзелкі прадстаўнікі ўлад у першую чаргу ўлічвалі фіскальныя інтарэсы дзяржавы. Пры гэтым пасля заключэння здзелкі куплі-продажу альбо заставы пакупнік ці крэдытор павінны былі выконваць адпаведныя павіннасці, якія былі накладзены на гэтую зямлю і выконваліся папярэднім уладальнікам. Калі прадстаўнік мясцовай улады сумняваўся, што будзе забяспечана выкананне павіннасцей, ён мог адмовіць ў санкцыянаванні здзелкі. Акрамя гэтага, дагавор мог быць скасаваны ўладамі і пасля яго заключэння ў выпадку, калі бакі здзелкі не забяспечвалі выкананне павіннасцей.

Нягледзячы на тое, што сяляне павінны былі атрымаць дазвол на здзяйсненне здзелкі з зямлёй, яны працягвалі ажыццяўляць іх без дазволу ўлад. Прычын гэтаму, на наш погляд, было некалькі. Па-першае, сяляне звычайна карысталіся звычаёвым правам, нормаў так званага земскага пісанага права яны не ведалі. А калі і ведалі, то не жадалі іх выконваць, бо гэтыя нормы парушалі «старыну». Па-другое, каб атрымаць дазвол, трэба было не проста звярнуцца да прадстаўнікоў органаў улады, але і заплаціць грошы за атрыманне дазволу. Зразумела, для сялян гэта было дорага, а для набыцця грошаў патрабавалася шмат намаганняў. Менавіта таму на практыцы сяляне здзяйснялі здзелкі з зямлёй без усялякага дазволу дзяржавы. У сувязі з гэтым часам і судовыя органы, у якіх рэгістраваліся здзелкі з зямлей, не патрабавалі «ліст дазволены» і ўсталёўвалі факт здзяйснення здзелкі.

Такая тэндэнцыя працягвалася досыць доўгі час па той прычыне, што для дзяржавы галоўным было атрыманне рэнты з зямельнага надзелу селяніна і выкананне ім павіннасцей. Увогуле пакуль перадача зямлі іншым асобам не закранала інтарэсаў дзяржавы, здзелкі сялян па куплі-продажу зямлі дазваляліся органамі ўлады. Аднак пры неабходнасці здзелкі куплі-продажу і заставы зямлі маглі быць скасаваны. Пры гэтым органы ўлады маглі скасаваць здзелку не толькі ў тым выпадку, калі адзін бок парушаў умовы здзелкі, але і тады, калі абодва бакі выконвалі ўмовы, але для дзяржавы было больш выгодным скасаванне такой здзелкі. Напрыклад, калі селянін застаўляў зямлю і пры гэтым ужо не мог выконваць свае павіннасці, суд скасоўваў здзелку і вяртаў зямлю даўжніку [10, № 222, 262].

Такім чынам, нягледзячы на тое, што да сярэдзіны XVI ст. сяляне лічылі сябе ўласнікамі зямлі, іх правы па распаражэнні зямлёй паступова абмяжоўваліся дзяржавай ці феадалам. Фактычна зямля пачала знаходзіцца ў пажыццёвым спадчынным землекарыстанні сялян. Селянін ужо не з’яўляўся ўласнікам зямлі, а быў яе карыстальнікам. Знаходзячыся ў статусе карыстальніка зямлі, селянін меў права валодаць ёю. Пры гэтым уласнік зямлі мог звяртацца ў суд, падаваць іскі, завяшчаць зямлю нашчадкам, а часам яе прадаваць і інш. Такія супярэчлівыя правы пераходзілі да яго нашчадкаў. Галоўным жа абавязкам карыстальніка зямлі было добрасумленнае вядзенне гаспадаркі, выкананне абавязкаў з зямельнага надзелу, выплата падаткаў, рэнты за зямлю. Правам жа неабмежаванага распараджэння зямлёй валодалі толькі феадалы ці дзяржава, якія былі яе рэальнымі ўласнікамі.

Пра тое, што сяляне паступова трацілі права ўласнасці на зямлю, сведчаць шматлікія факты, у тым ліку падараванні вялікімі князямі зямель разам з сялянамі іншым феа-

даламі. Аднак калі сяляне былі не задаволены новым уладальнікам зямлі, то яны маглі сысці і пасяліцца на зямлі іншага феадала. Часам нават пры падараваннях зямлі ўказвалася, што землі перадаюцца феадалу, а сялян трэба «выгнати» ці «сагнати» [15, л. 43, 67]. Гэта таксама сведчыць пра тое, што феадалы ўжо не прызнавалі права ўласнасці на зямлю, аднак сяляне яшчэ мелі права пераходу да іншых феадалаў пры ўмове, калі яны разлічыліся з папярэднім уладальнікам. Пры гэтым канчатковага заканадаўчага замацавання прыгоннага права ў пазначаны перыяд не было.

**Заключэнне**

Такім чынам, у першай палове XVI ст. сяляне працягвалі валодаць даволі шырокімі паўнамоцтвамі ў адносінах да зямлі на падставе прынцыпу «старыны». У тым ліку яны маглі распараджацца зямлёй шляхам заключэння дагавораў куплі-продажу, заставы і інш. Акрамя таго, як правіла, сялянская зямля пераходзіла нашчадкам у спадчыну.

Паступовa дзяржава ўсё больш абмяжоўвае гэтыя правы сялян. Так, адпаведна новаму заканадаўству Вялікага Княства Літоўскага заключэнне дагавораў па распараджэнні зямлёй стала дазваляцца толькі са згоды феадалаў-землеўладальнікаў. Пры гэтым сяляне часам здзяйснялі здзелкі без іх дазволу, што сведчыць, на наш погляд, не аб праве ўласнасці сялян на зямлю, а толькі аб парушэнні нормаў агульнадзяржаўнага заканадаўства. Пра тое, што сяляне не распараджаліся зямлёй, сведчаць многія факты. Напрыклад, здзелка, заключаная ў адпаведнасці з нормамі права, магла быць скасавана службовымі асобамі па прычыне таго, што яна не задавальняла фіскальным інтарэсам дзяржавы. Пра гэта сведчаць і факты выгнання сялян з той зямлі, якая перадавалася вялікім князем іншаму феадалу.

Фактычна ў першай палове XVI ст. пераважная большасць сялян Вялікага Княства Літоўскага ўжо не з'яўлялася ўласнікамі зямлі, а валодала толькі правам пажыццёвага спадчыннага землекарыстання. Было замацавана нарматыўна, што толькі з дазволу ўласніка зямлі селянін мог распарадзіцца зямлёй – прадаць яе або замяніць, аддаць у арэнду і інш. Пры гэтым нельга не заўважыць, што не толькі ў XVI ст., але і значна пазней сустракаліся асобныя факты продажу сялянамі зямлі як уласнай. Акрамя таго, у сялян заставалася права пераходу на землі іншых землеўладальнікаў пры ўмове належнага разліку з феадалам.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Владимирский-Буданов, М. Ф. Очерки из истории Литовско-Русского права. 6: Церковное имущество в Юго-Западной Руси XVI в. / М. Ф. Владимирский-Буданов. – Киев : Тип. С. В. Кульженко, 1907. – 224 с.

2. Новицкий, И. П. Очерк истории крестьянского сословия Юго-Западной России в XV–XVIII веке : (предисловие к 1 тому VI части «Архива Юго-Западной России») / И. П. Новицкий. – Киев : Унив. тип. (И. И. Завадского), 1876. – 161 с.

3. Любавский, М. Областное деление и местное управление Литовско-русского государства. Ко времени издания первого литовского статута / М. Любавский. – СПб. : Тип. Императ. Акад. Наук, 1895. – 997 с.

4. Голубеў, В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі, XVI–XVIII стст. / В. Ф. Голубеў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 173 с.

5. Козловский, П. Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в. – Минск : Наука и техника, 1982. – 206 с.

6. Спиридонов, М. Ф. Застава-закуп земли государственными крестьянами Белоруссии в XVI в. / М. Ф. Спиридонов // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. – Вильнюс : Минтис, 1974. – С. 57–64.

7. Яцкевич, И. Г. Договор купли-продажи земли в Великом княжестве Литовском в конце XV – первой половине XVI веков: историко-правовые аспекты / И. Г. Яцкевич // Юрид. журн. – 2008. – № 3 (15). – С. 7–11.

8. Яцкевич, И. Г. Деятельность субъектов правоотношений в сфере распоряжения земельными владениями в Великом Княжестве Литовском в конце XV – первой половине XVI в.

[Электронный ресурс] / И. Г. Яцкевич // Электрон. б-ка БГУ. – Режим доступа: https://elib.bsu.by›bitstream›8_яцкевич. – Дата доступа: 20.02.2022.

9. Спиридонов, М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.) / М. Ф. Спиридонов. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 222 с.

10. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией : в 39 т. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1865–1915. – Т. 17 : Акты Гродненского земского суда (1539–1565 гг.) / предисл. К. Снитко. – 1890. – 559 с.

11. Груша, А. Улада непарушнасці і памяці: «старина» і яе трансфармацыя ў XV – першай трэці XVI ст. / А. Груша // СОЦІУМ. Альм. соц. історії. – Київ, 2013. – Вип. 10. – С. 216–245.

12. Русская историческая библіотека, издаваемая Археографическою комиссіею : в 40 т. – СПб. :Сенат. тип., 1903. – Т. 20. – 1120 с.

13. Спірыдонаў М. Ф. Аб сутнасці продажу-куплі зямлі сялянамі Беларусі ў першай палове XVI ст. (па адміністрацыйна-судовых справах Гродзенскага старасты) / М. Ф. Спірыдонаў // Вес. Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1971. – № 3. – С. 92–101.

14. Статут Великого Княжества Литовского 1529 года. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1960. – 254 с.

15. Lietuvos metrika : 586 kn. – Vilnius : Zara, 1998. – Kn. 3 : 1440–1498 / Lietuvos istorijos institutas ; parengė: L. Anužytė, A. Baliulis. – 161 c.

## REFERENCES

1. Vladimirskij-Budanov, M. F. Ochierki iz istorii Litovsko-Russkogo prava. 6: Cerkovnoje imushchiestvo v Jugo-Zapadnoj Rusi v XVI v / M. F. Vladimirskij-Budanov. – Kijev : Tip. S. V. Kul’zhenko, 1907. – 224 s.

2. Novickij, I. P. Ochierk istorii kriest’janskogo soslovija Jugo-Zapadnoj Rossii v XV–XVIII viekie : (priedislovije k 1 tomu VI chasti «Archiva Jugo-Zapadnoj Rossii») / I. P. Novickij. – Kijev : Univ. tip. (I. I. Zavadskogo), 1876. – 161 s.

3. Liubavskij, M. Oblastnoje dielienije i miestnoje upravlienije Litovsko-Russkogo gosudarstva. Ko vriemieni izdanija piervogo litovskogo statuta / M. Liubavskij. – SPb. : Tip. Impierat. Akad. Nauk, 1895. – 997 s.

4. Holubieu, V. F. Sialianskaje ziemlieuladannie i ziemliekarystannie na Bielarusi, XVI–XVIII stst. / V. F. Holubieu. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1992. – 173 s.

5. Kozlovskij, P. G. Ziemlievladienije i ziemliepol’zovanije v Bielorussii v XVIII – piervoj polovinie XIX v. – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1982. – 206 s.

6. Spiridonov, M. F. Zastava-zakup ziemli gosudarstviennymi kriest’janami Bielorussii v XVI v. / M. F. Spiridonov // Jezhegodnik po agrarnoj istorii Vostochnoj Yewropy. – Вильнюс : Минтис, 1974. – С. 57–64.

7. Yackievich, I. G. Dogovor kupli-prodazhi ziemli v Vielikom kniazhestvie Litovskom v konce XV – piervoj polovinie XVI v.: istoriko-pravovyje aspiekty / I. G. Yackievich // Jurid. zhurn. – 2008. – № 3 (15). – S. 7–11.

8. Yackievich, I. G. Diejatiel’nost’ subjektov pravootnoshenij v sfierie rasporiazhenija ziemiel’nymi vladienijami v Vielikom kniazhestvie Litovskom v konce XV – piervoj polovinie XVI v. [Eliektronnyj riesurs] / I. G. Yackievich // Eliektron. b-ka BGU. – Riezhim dostupa: https://elib.bsu.by›bitstream›8_яцкевич. – Data dostupa: 20.02.2022.

9. Spiridonov, M. F. Zakrieposhchienije kriest’janstva Bielarusi (XV–XVI vv.) / M. F. Spiridonov. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1993. – 222 s.

10. Akty, izdavajemyje Vilienskoj arkhieografichieskoj romissijej : v 39 t. – Vil’na : Tip. A. G. Syrkina, 1865–1915. – T. 17 : Akty Grodnienskogo ziemskogo suda (1539–1565 гг.) / priedisl. K. Snitko. – 1890. – 559 s.

11. Hrusha, A. Ulada nieparushnasci i pamiaci: «starina» i jaje transfarmacyja u XV – piershaj treci XVI st. / A. Hrusha // SOCIUM. Al’m. soc. istoriji. – Kyjiv, 2013. – Vyp. 10. – S. 216–245.

12. Russkaja istorichieskaja bibliotieka, izdavajemoja Arkhieografichieskoju kommissijeju : v 40 t. – SPb. :Sienat. tip., 1903. – T. 20. – 1120 s.

13. Spirydonau, M. F. Ab sutnasci prodazhu-kupli ziamli sialianami Bielarusi u piershaj palovie XVI st. (pa administracyjna-sudovykh spravakh Grodzienskaha starasty) / M. F. Spirydonau // Vies. Akad. navuk BSSR. Sier. hramad. navuk. – 1971. – № 3. – S. 92–101.

14. Statut Vielikogo Kniazhestva Litovskogo 1529 goda. – Minsk : Izd-vo Akad. nauk BSSR, 1960. – 254 s.

15. Lietuvos metrika : 586 kn. – Vilnius : Zara, 1998. – Kn. 3 : 1440–1498 / Lietuvos istorijos institutas ; parengė: L. Anužytė, A. Baliulis. – 161 c.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 10.04.2022*